# ПАЛЯКІ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ Ў 20-я ГАДЫ XX СТ. У СВЯТЛЕ ПОЛЬСКАМОЎНЫХ КРЫНІЦ

**Сідорэнка В.М.**

У 20-я г ХХст у сувязі з беларусізацыяй нацыянальныя меншасці атрымалі магчымасць свабодна развіваць сваю культуру на роднай мове. Аб'яўленне чатырох моў дзяржаўнымі: беларускай, польскай, рускай, яўрэйскай выклікала з'яўленне адпаведнай дакументацыі. Такім чынам можна сказаць, што польскамоўныя крыніцы сталі прадуктам беларусізацыі. Са згортваннем яе у канцы 20-х – пачатку 30-х гг колькасць польскамоўных матэрыялаў значна скарачаецца, а хутка яны знікаюць як самастойныя дакументальныя комплексы.

Польскамоўныя матэрыялы захоўваюцца у архівах, апублікаваных зборнікаў няма. Такімі архівамі на Гомельшчыне з'яўляюцца Дзяржаўны Архіў Гомельскай Вобласці і Дзяржаўны архіў Грамадскіх Аб'яднанняў Гомельскай Вобласці. Архіўныя справы напоўнены разнастайнымі і рознапланавымі комплексамі матэрыялаў. Гэта дазваляе шматбакова падыйсці да вывучэння праблематыкі становішча польскага насельніцтва у 20-я гады XX ст. Вядучай задачай на першым этапе аналізу польскамоўных крыніц прадстаўляецца іх класіфікацыя. Зрабіць гэта неабходна дзеля высвятлення больш устойлівага і рэпрэзентатыўнага комплексу матэрыялаў. Увесь комплекс польскамоўных крыніц можна разбіць на сем буйных груп: 1.Нарматыўныя акты; 2.Планавыя матэрыялы; 3.Справаздачы;

4.Распарадчыя дакументы; 5.Статыстычныя дакументы;6.Даведачна-справачныя матэрыялы; 7.Перыёдыка.

Найбольшую цікавасць уяуляюць справаздачы, нарматыуныя акты і распарадчыя дыкументы. Справаздачы (Sprawozdania) і акты рэвізій (Akty rewizijne ) прадстауляюць стан спрау сярод польскага насельніцтва на месцах. Да гэтага тыпу крыніц належаць рознатэрміновыя справаздачы польбюро Губкома, Акружкома, справаздачы павятовых польбюро, секцый , польскіх сельсаветау, акты аб правядзенні рэвізій і інспекцый на месцах. Часам падаваемыя звесткі не заусёды аб'ектыуныя. Нарматыуныя акты і загады зыходзілі ад ЦК РКП(б), Польбюро ЦК РКП(б), ад ЦК КП(б)Б і Польбюро ЦК КП(б)Б, ад асобных наркаматау. Найбольш буйную па колькасці групу польскамоуных крыніц уяуляе распарадчая дакументацыя, спраукі і даведкі. Важным колам крыніц з'яуляюцца матэрыялы статыстычнага характару. Па форме гэта разнастайныя дакументы: анкеты, спраукі, адказы мясцовых польбюро на запыты Гомельскага польбюро пры Губкоме/Акружкоме, таблiцы, што ідуць у дадатак да справаздач, лісты ад настаунікау і загадчыкау польскіх школ (звесткі аб колькасці , узросце і падрыхтаванасці вучняу і г.д.) Да ліку перыядычных выданняу адносяцца газеты і часопісы на польскай мове: "ORKA", "MLOT", "TRYBUNA KOMUNISTYCZNA", "GLOS KOMUNISTY", ISKRA KOMUNIZMU", "MLODY TOWARZYSZ".

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ